Веснік Глыбоччыны

vg-gazeta.by

ГАЗЕТА РАЁННАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА І РАЁННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ

серада, 19 ліпеня 2017 года № 57 (9713)






# ПЯТЫ МІЖНАРОДНЫ ВІШНЁВЫ ФЕСТЫВАЛЬ У ГЛЫБОКІМ







**СПЕЦЫЯЛЬНЫ ВЫПУСК**

Вішнёвы фестываль

## ПАВАЖАНЫЯ ГЛЫБАЧАНЕ, ЗЕМЛЯКІ, ШАНОЎНЫЯ ГОСЦІ!

Ад імя Глыбоцкага раённага выканаўчага камітэта, раённага Савета дэпутатаў мы рады вітаць вас на нашай слыннай працалюбівай гасціннай Глыбоччыне. А збірае нас на ліпеньскую сустрэчу спелая, з салодкім смакам лета, глыбоцкая вішня. Яна аблюбавала гэтыя мясціны, бо тут – дагледжаная, сагрэтая цеплынёй рук чалавека зямля-карміліца.

Дзякуючы аграному-селекцыянеру Баляславу Лапыру, які пасадзіў вішнёвыя дрэўцы ў Глыбокім, і прыгажуні-вішні, якая тут прыжылася і памнажае свой вішнёвы "род", на нашай зямлі нарадзіўся "Вішнёвы фестываль", які сёлета адзначае свой першы 5-гадовы юбілей. І яшчэ адна прыемная навіна, звязаная з ім: у гэтым годзе глыбоцкі "Вішнёвы фестываль" набыў статус Міжнароднага, а гэта значыць, што наш горад пацвердзіў імідж творчага ініцыятыўнага краю, які з цягам часу можа стаць турыстычным цэнтрам. Мы павінны прыкласці ўсе намаганні, каб вішнёвая сталіца здзіўляла гасцей чысцінёй, прыгажосцю, крэатыўным афармленнем і, вядома ж, багатым ураджаем дасягненняў і поспехаў.

На працягу пяці дзён у Глыбокім будуць гучаць вішнёвыя матывы, юбілейныя акорды, пройдуць мерапрыемствы, што ўшаноўваюць каралеву-вішню і чалавека працы, які яе даглядае, дапамагае ісці ў рост, умацоўвае імідж горада, як фестывальнай сталіцы.

Жадаем, каб усе вы, паважаныя глыбачане, з гонарам трымалі марку жыхароў вішнёвай сталіцы, былі каралямі і каралевамі свайго жыцця, сустракалі кожны дзень з аптымізмам, працоўным плёнам мацавалі дабрабыт краю, а гасцям горада – незабыўных уражанняў ад знаходжання на Глыбоччыне, новых знаёмстваў, цікавых адкрыццяў, вішнёвага настрою і прыемных сюрпрызаў.

***А. В. МОРХАТ, старшыня Глыбоцкага раённага выканаўчага камітэта,***
***Г. У. УНУКОВІЧ, старшыня Глыбоцкага раённага Савета дэпутатаў.***

**ПОГОДА В ГЛУБОКОМ**

| Сегодня, 19 июля | Чт, 20 июля | Пт, 21 июля |
|---|---|---|
| +9°C...+21°C | +9°C...+22°C | +9°C...+23°C |

| Курсы валют | | 17.07.17 | 18.07.17 |
|---|---|---|---|
| EUR | 1 Евро | 2,2418 | 2,2331 |
| USD | 1 Доллар США | 1,9645 | 1,9513 |
| RUB | 100 Российских рублей | 3,2868 | 3,3025 |




# ПАВАЖАНЫЯ АРГАНІЗАТАРЫ, УДЗЕЛЬНІКІ, ШАНОЎНЫЯ ГОСЦІ ФЕСТЫВАЛЮ!

**Барыс СВЯТЛОЎ, Міністр культуры Рэспублікі Беларусь:**



– Ад шчырага сэрца дасылаю вам віншаванні з нагоды юбілейнага "Вішнёвага фестывалю", які сёлета ў пяты раз збірае сяброў на слынней спеўнай прыгожай глыбоцкай зямлі.

Яшчэ адной важнай і значнай яго адметнасцю з'яўляецца тое, што менавіта ў гэтым годзе фестываль набыў статус міжнароднага. Вішнёвае свята – гэта самабытная культурная дзея і падзея, як для жыхароў Глыбоччыны, так і для гасцей горада. Яно ўмацоўвае мясцовыя традыцыі, прэзентуе новыя ідэі і магчымасці, спрыяе абмену культурнымі набыткамі, умацоўвае творчыя і сяброўскія сувязі, сплятае ў суквецці здабыткі таленавітых спевакоў, кампазітараў, музыкантаў, мастакоў, народных майстроў.

"Вішнёвы фестываль" кожны год падрастае ў сваім прафесійным майстэрстве, становіцца шматгранным, яго праграма – універсальнай – разнастайнай і цікавай для людзей рознага ўзросту і інтарэсаў. Развіваючы рэгіянальную культуру, мы зможам папоўніць нацыянальную скарбонку краіны каштоўнай спадчынай і перадаць яе будучым пакаленням.

У добры шлях, юбілейны "Вішнёвы фестываль" Глыбоччыны!

# СЕРДЕЧНО ПРИВЕТСТВУЮ УЧАСТНИКОВ И ГОСТЕЙ ПЯТОГО МЕЖДУНАРОДНОГО ПРАЗДНИКА «ВИШНЁВЫЙ ФЕСТИВАЛЬ»!

**Николай ШЕРСТНЁВ, председатель Витебского областного исполнительного комитета:**



– "Вишнёвый фестиваль" в г. Глубокое занимает свое заметное место в культурной жизни области. Сегодня мы являемся свидетелями того, что традиции сохранения и развития музыкального и песенного творчества продолжаются, а само событие получило известность и признание в стране и за ее пределами.

С каждым годом расширяется география участников и гостей. В этом году фестиваль собрал представителей из России, Китая, Израиля, Франции, Польши, Латвии, Литвы, Эстонии, Молдовы, Грузии. Развивающееся сотрудничество помогает приобщиться к особенностям культуры разных народов, установить новые творческие связи между коллективами-участниками.

Время подтвердило: идея фестиваля имеет хорошую почву, основываясь на своеобразной ауре, богатом историческом наследии Глубоччины. Каждый год весной райцентр утопает в белом цвету вишен, а летом они радуют обильным урожаем красных сочных ягод. В свое время местный селекционер Болеслав Лапырь вывел зимостойкие сорта вишен. С его садов сладкая ягода шагнула в здешние усадьбы, распространилась по всему краю.

Сохранение этих традиций является не единственной особенностью фестиваля. В программе нынешнего — научно-практическая конференция, районная спартакиада среди руководителей учреждений, предприятий, организаций и работников госорганов, посадка дубравы, разнообразные выставки, конкурсы, концертные программы. Традиционно молодые пары района скрепляют семейными узами свою судьбу на торжественной регистрации брака "Вишнёвая свадьба". Новой страницей мероприятия станет открытие декоративно-художественной композиции "Дружба народов" как символ единения разных культур.

Уверен, что первый юбилей фестиваля станет новым этапом в расширении и развитии межнациональных и межгосударственных культурных контактов.

Искренне желаю участникам и гостям праздника здоровья, отличного настроения, интересных встреч, приятных впечатлений от знакомства с гостеприимной глубокской землей!





# «ДРУЖБА НАРОДАЎ» – НА ЦЭНТРАЛЬНАЙ ПЛОШЧЫ ГОРАДА

● Галіна СУТУЛА. Фота Андрэя ПАНКРАТА.




Яшчэ адзін падарунак роднаму гораду да Вішнёвага фестывалю.

ДЭКАРАТЫЎНА-МАСТАЦКАЯ КАМПАЗІЦЫЯ "ДРУЖБА НАРОДАЎ", ЯКАЯ З'ЯЎЛЯЕЦЦА СВОЕАСАБЛІВЫМ СІМВАЛАМ МІЖНАРОДНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА ГЛЫБОЧЧЫНЫ З КРАІНАМІ БЛІЗКАГА І ДАЛЁКАГА ЗАМЕЖЖА, БЫЛА ЎСТАНОЎЛЕНА НАПЯРЭДАДНІ "ВІШНЁВАГА ФЕСТЫВАЛЮ" НА ЦЭНТРАЛЬНАЙ ПЛОШЧЫ ГЛЫБОКАГА.

Яна ўяўляе сабой вялікую, секцыйную двух'ярусную каваную канструкцыю, якую зрабілі работнікі прыватнага прадпрыемства "У ажуры" пад кіраўніцтвам Юрыя Татарыновіча. Цэнтральнае месца экспазіцыі займае зямны шар, вакол якога – жыхары планеты, якіх аб'ядноўваюць агульныя мэты і сяброўства. Гадзіннік паказвае час, за які кожны з нас павінен паспець зрабіць шмат добрага і адметнага для таго, каб наша зямля квітнела і прыгажэла. Гадзіннік светадыёдны, вечарам будзе цудоўна глядзецца. З бакоў канструкцыі – беларускі арнамент, упрыгожаны залацістым напыленнем, а на самым версе канструкцыі – ангел-ахоўнік, які аберагае мір і спакой на планеце, дзе мы ўсе жывём.

–Тры гады назад старшыня райвыканкама Алег Віктаравіч Морхат, вярнуўшыся з замежнай паездкі, расказаў пра цікавую кампазіцыю, якую ён убачыў. Прайшоў час і яе вобраз, толькі ўжо адаптаваны да беларускай рэчаіснасці, нашых традыцый і культуры, я занатаваў на паперы. Чакаў нагоды, калі выпадзе магчымасць ажыццявіць задуманае. Як кажуць, усяму свой час і ён настаў. "Вішнёвы фестываль" сёлета адзначае пяцігадовы юбілей з дня "нараджэння", да таго ж, менавіта з гэтага года ён набыў статус міжнароднага, а значыць, будзе служыць мэце ўмацавання сяброўскіх сувязяў. Таму спешнымі тэмпамі мы ўзяліся за работу, і ўжо 14 ліпеня першыя элементы канструкцыі былі ўсталяваны. Для глыбачан і гасцей горада, лічу, гэта выдатны падарунак, – сказаў Юрый Мар'янавіч. – Урачыстае адкрыццё кампазіцыі адбудзецца ў галоўны дзень свята – 22 ліпеня.



# ВАШ ВЫХАД, КАРАЛЕВА!

● Алесь ЖЫГУНОЎ.

**ПАДСВІЛЬЧАНКА СВЯТЛАНА ДЗЯКУН І СЁЛЕТА ВА ЎСЁЙ КРАСЕ ПАЎСТАНЕ ПЕРАД НАМІ Ў ВОБРАЗЕ ВІШНЁВАЙ КАРАЛЕВЫ: У ПЯТЫ РАЗ ПРЫВІТАЕ ЯНА ГАРАДЖАН І ШМАТЛІКІХ ГАСЦЕЙ "ВІШНЁВАГА ФЕСТЫВАЛЮ". ГЭТАЯ ПРЫГОЖАЯ, З СОНЕЧНАЙ УСМЕШКАЙ, ЖАНЧЫНА, ПРОСТА НАРОДЖАНА БЫЦЬ КАРАЛЕВАЙ: АКРАМЯ ЯРКАЙ ЗНЕШНАСЦІ, МАЕ ЯНА І ГЛЫБОКІ РОЗУМ, І ШЫРОКУЮ ДУШУ, НАПОЎНЕНУЮ ЛЮБОЮ К ЛЮДЗЯМ. УСЁ, ЛІТАРАЛЬНА ЎСЁ АТРЫМЛІВАЕЦЦА Ў ЯЕ І НА СЦЭНЕ – НА СВОЕАСАБЛІВЫМ ТРОНЕ, – І ВА ЎЗАЕМІНАХ СА СВАІМІ ПАДДАНЫМІ, ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ, З НАМІ, У ДНІ "ВІШНЁВАГА ФЕСТЫВАЛЮ".**

Са Святланай сустрэліся за некалькі дзён да свята і дамовіліся, што размова наша будзе шчырая і адкрытая.

**– Набліжэнне свята адчуваеш?**

– З кожным днём усё больш і больш. Вось чытаю сцэнарый свята, хвалююся, канечне: трэба ж усё вывучыць, каб не забыцца. Прыйдзецца, мусіць, узяць з сабой папку з тэкстам. На ўсякі выпадак. А яшчэ збіраюся ў дарогу – паеду ў Віцебск на прымерку новай сукенкі. Шыюць яе ў атэлье пры драматычным тэатры імя Якуба Коласа. Эскізы прысылалі, раіліся са мной. Што за сукенка – сакрэт, але мы думаем здзівіць усіх, хто будзе на свяце.

**–Пяты фестываль у ролі Каралевы. Такое пастаянства ўражвае.**

–Кожны год, калі заканчваецца свята, думаю: гэта ўсё, гэта апошні фестываль. На наступны мяне ўжо не хопіць: многа людзей, многа вачэй, хто дае энергію, хто забірае. Адчуванне – стамілася. Хачу адпачыць. Два дні адпачываю, а потым атрымліваю асалоду ад успамінаў, уся – у радасці, у эйфарыі. Калі ўсё атрымліваецца, то для мяне гэта перамога, гэта трыумф.

**–Твае родныя падзяляюць з табой гэтую радасць?**

–Канечне.

**–Цікава: як ставіцца твой муж да таго, што ўжо столькі гадоў ты выступаеш у ролі гаспадыні фестывалю, што на цябе, такую прыгожую, такую яркую, глядзяць сотні, тысячы людзей. У тым ліку і мужчыны. Не раўнуе?**

– Муж ставіцца да гэтага стрымана, роўна. Што я стала Вішнёвай Каралевай, для яго не сенсацыя. Для яго я заўсёды была каралевай, з першага дня нашай сустрэчы. Думаю, што, "займеўшы каралеўства", лепшай, прыгажэйшай у ягоных вачах не стала. І дзеці з маленства прывыклі да таго, што я заўсёды на сцэне – вяду праграмы, чытаю вершы, спяваю. Дарэчы, у гэтым годзе споўнілася 20 гадоў майму дзіцячаму калектыву "Домісолька". Дваццаць гадоў творчасці! На юбілей прыехалі ўсе былыя выхаванцы. Сярод іх – Юлія Сівіцкая, наша сённяшняя зорачка, слаўная, мілая дзяўчынка. У калектыве было шмат яркіх таленавітых дзяўчынак. І я так рада за іх. Упэўнена, што любоў да песні паможа ім знайсці сябе ў жыцці.

**– А што змянілася ў тваім жыцці за апошнія гады?**

–Многае: стала тройчы бабуляй. Як праходзіў першы фестываль, была адна ўнучка – Ксенія, а сёння нас радуюць яшчэ тры ўнучкі: Елізавета, Анастасія і Сафійка. Усе чатыры – мае прынцэсы, мае вішанькі. З мужам выгадавалі двух сыноў, а я заўсёды марыла пра дзяўчынак. І Бог падарыў нам такую радасць, такое шчасце.

**–Чатыры "Вішнёвыя фестывалі" – у гісторыі. Які з іх запомніўся найбольш?**

–Першы. Калі прапанавалі гэтую ролю, узрадавалася: гэта ж падарунак лёсу, можна сказаць, крок у нязведанае – як я буду трымацца сябе на сцэне, як паводзіць, як урэшце мяне ўспрымуць гледачы? Без шчырых памочнікаў, прыгадаю тут Аліну Віктараўну Юргель, Таццяну Леанідаўну Малатоўнік, Алену Генадзьеўну Заяц, з мяне наўрад што атрымалася. К першаму фестывалю купілі дыядэму, калье, завушніцы, да каралеўскай сукенкі мы кожную блёстку прыдумвалі. Боязна было. Пазней стала прасцей. Запомніўся і трэці фестываль, калі мне падалі карэту. Прызнаюся: як першы раз выходзіла з карэты, то хвалявалася дужа: столькі людзей глядзяць на цябе, а ў думках адно: а можа, з сукенкай што, а можа, я змяла яе…Гэта быў адказны момант. Да кожнага фестывалю арганізатары прыдумваюць штосьці новае. Летась, напрыклад, праграму вялі ўдваіх з Паўлам Пеляёнкам, які выступаў у ролі барона Мюнхгаўзена.

**–Мабыць, за чатыры фестывалі ты ўжо прывыкла да ролі Вішнёвай Каралевы, таму і не хвалюешся вельмі. На тваю думку, у тваёй знешнасці, у характары, ёсць штосьці ад сапраўднай каралевы, не вішнёвай? Што-небудзь каралеўскае?**

–(Хвілінку падумаўшы). Думаю, што ёсць: па характары я гордая.

**– І як цябе, такую гордую, успрымаюць на працы?**

–На працы (у дзіцячым садку – аўт.) мяне ўспрымаюць як калегу, як Святлану Леанідаўну. Гэта ў бібліятэцы, у Доме культуры ка мне ставяцца больш узнёсла, могуць сказаць: "Ах, Вішнёвая Каралева!". А я як была простая, шчырая, даверлівая к людзям, такой і застаюся. Нягледзячы ні на што. Хтосьці мной захапляецца, любіць, а хтось – не ўспрымае, зайздросціць. А некаму я проста не падабаюся.

**–Паспяховы чалавек у некаторых людзей выклікае непрыязнасць. Але не будзем пра гэта. Чым захапляецца Вішнёвая Каралева?**

– Люблю кнігі чытаць, класічную музыку люблю, асабліва Моцарта, люблю спяваць, сцэну люблю…

**–Ці шчаслівая ты, пытацца не буду. І ўсё ж?**

–Шчасце кожны разумее па-свойму. У адзін з выхадных дзён сядзім з мужам на тэрасе, тры ўнучкі з намі, бегаюць. Я і кажу: "Ведаеш, бацька, я хацела б павандраваць, на мора паехаць, на пясочку паляжаць, а мне трэба ў нянькаў быць, ежу гатаваць…". А муж мне ў адказ: "У кагосьці шчасце – паездка на мора, і ён месяц, а то і больш, будзе грэцца сваімі ўспамінамі. А ў цябе ёсць дом, дзеці, унучкі любімыя, ёсць шчырыя і верныя сябры, ёсць я. Ці ж гэта не шчасце?"

**–І што ты адказала?**

–Канечне ж, шчасце!

**–Удачы табе, Вішнёвая Каралева!**

–Дзякую.



## ВІШАНЬКІ-НОТКІ

Хто не ведае лагатып "Вішнёвага фестывалю"? Вішанькі-Ноткі сталі пазнавальным брэндам Глыбокага. Згадаем гісторыю іх узнікнення. Выбіралі галоўны сімвал свята шляхам галасавання з чатырох варыянтаў. Вішанькі-Ноткі пад №2 сталі пераможцамі галасавання і на інтэрнэт-сайце "Весніка Глыбоччыны", і ў выніку падліку тэлефонных званкоў у рэдакцыю.

Вось ужо на працягу пяці гадоў і спяваюць разам з намі фестывальныя Вішанькі-Ноткі.



# ПЯЦЬ ФЕСТЫВАЛЬНЫХ ГАДОЎ

**2013**

## ПЕРШЫ. СОНЕЧНЫ. ВІШНЁВЫ.

ПЕРШЫ "ВІШНЁВЫ ФЕСТЫВАЛЬ". ТАКІ ЧАКАНЫ. ЗАДУМАНЫ Ў 2012 ГОДЗЕ І ПРАВЕДЗЕНЫ Ў ЛІПЕНІ 2013-ГА. ЧЫМ ЁН ЗАПОМНІЎСЯ НАМ? ЗГАДАЕМ РАЗАМ.

30 красавіка быў закладзены вішнёвы сад у гонар правядзення ў Глыбокім "Вішнёвага фестывалю". 1414 маленькіх дрэўцаў пасаджаны гараджанамі пры ўездзе ў горад з боку вёскі Арэхаўна.

А 24 ліпеня ўжо загучалі першыя акорды "Вішнёвага фестывалю". Дзеці, моладзь, старэйшае пакаленне – сталі першымі яго ўдзельнікамі.

Прабачце, што слова "першы" будзе паўтарацца так часта – усё ж адбывалася ўпершыню (цяпер, на пятым, – гэта ўсё можна назваць традыцыйным). І знаёмства з Вішнёвай Каралевай, у ролі якой выступіла Святлана Дзякун… І "Вішнёвае вяселле" з урачыстай рэгістрацыяй шлюбу, калі перад глыбачанамі-землякамі абяцанне дзяліць радасць і смутак на дваіх далі Алег і Юлія Раманчукі, Аляксандр і Людміла Белыя, Дзяніс і Анастасія Сарокі, Яўген і Марына Русакі… І



інвестыцыйны форум, які сабраў больш за дзвесце прадстаўнікоў краін Латвіі і Літвы, Мінска і Віцебска, рэгіёнаў вобласці… І навукова-практычная канферэнцыя для садаводаў-аматараў, удзельнікамі якой былі спецыялісты па селекцыі вішні… І афіцыйнае гашэнне паштовай маркі спецыяльным штэмпелем "Вішнёвага фестывалю"…

Несумненна, самай значнай падзеяй першага фестывалю стала адкрыццё ў горадзе манументальна-дэкаратыўнай скульптуры «Вішанька», якая стала любімым месцам глыбачан і гасцей горада. Скульптар Іван Казак адмыслова стварыў яе ў выглядзе гронкі з трыма вішнямі – як увасабленне сям'і, дзе ёсць тата, мама і дзіця.

Апошні дзень фестывалю, 27 ліпеня, быў асабліва багаты на цікавыя мерапрыемствы: конкурс падворкаў, свята кветак, выставы вырабаў народных майстроў Глыбоччыны, тэматычныя канцэрты і завяршальны фестывальны акорд – аўкцыён "Вішнёвы пірог". Між іншым, першы "Вішнёвы фестываль" адразу стаў "міжнародным", бо сабраў гасцей з замежжа – Літвы, Латвіі, Галандыі, Расіі, Польшчы, Арменіі, Ізраіля, Германіі і Малдовы.

І кожны з арганізатараў, удзельнікаў і гасцей "Вішнёвага фестывалю", адчуўшы яго салодкі смак і ўбачыўшы яркія фарбы, спадзяваўся на доўгае яго жыццё.



**2014**

## ПАД ЮБІЛЕЙНЫЯ АКОРДЫ!

ГЭТЫ ГОД ДЛЯ ГЛЫБОЧЧЫНЫ БЫЎ ДВОЙЧЫ ЮБІЛЕЙНЫ: 3 ЛІПЕНЯ ЯГО ЖЫХАРЫ АДЗНАЧАЛІ ДЗВЕ ВАЖНЫЯ ГІСТАРЫЧНЫЯ ДАТЫ: 600-ГОДДЗЕ З ДНЯ ЗАСНАВАННЯ РОДНАГА ГОРАДА І 70-ГОДДЗЕ З ДНЯ ЯГО ВЫЗВАЛЕННЯ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ.

Шырокамаштабнае свята, падчас якога на вуліцах горада "сышліся шэсць стагоддзяў", гучалі фанфары ў гонар славутых землякоў, ветэранаў вайны і працы, абумовіла працягласць "Вішнёвага фестывалю": у той год ён праходзіў толькі адзін дзень – 19 ліпеня. Нягледзячы на гэта, кожны глыбачанін і госць мог выбраць для сябе мерапрыемства па душы. Адбылося традыцыйнае шэсце з Вішнёвай Каралевай. Яна была паўнапраўнай гаспадыняй свята і расказала легенду пра шчаслівую вішаньку, згодна якой дастаткова толькі дакрануцца да спелых "скульптурных" ягад і жаданне – збудзецца. Цэлы дзень працавалі "Горад майстроў", дзе былі прадстаўлены вырабы дэкаратыўна-прыкладной творчасці на любы густ, выстава дзіцячых малюнкаў "Вішнёвая рапсодыя", сельскія падвор'і. На Цэнтральнай плошчы артысты спявалі пра "Спелых вішняў духмянасць", праходзіла эстрадная праграма "Вішнёвае лета", задорная вішнёвая дыскатэка. Глыбачане гулялі на вішнёвым вяселлі і апладысментамі падтрымлівалі маладыя сямейныя пары, што прынялі ўдзел у конкурсе "У гасцях у вішанькі", які праходзіў у той год упершыню. На дзіцячай пляцоўцы "Брыганціна" забаўляліся і весяліліся дзеці. Пад акорды фестывалю падарункі за "Лепшыя вішнёвыя падвор'і" атрымлівалі прыватныя гаспадары і старшыні сельсаветаў. А яшчэ ўдзельнікі і госці маглі набыць сувенірныя біяраскладальныя пакеты з "вішнёвымі ноткамі". Дзякуючы фінансавай падтрымцы прадпрыемстваў, арганізацый горада, прадпрымальнікаў, іх, у рамках рэалізацыі праекта "ЭкаГлыбокае", закупілі актывісты РА РГА "Белая Русь".

"Вішнёвае" каралеўства парадавала глыбачан цудоўнымі песнямі, смачнымі пачастункамі, конкурсамі і забавамі, развіталася да наступнага года.



Сямейныя спаборніцтвы ў конкурсе "У гасцях у вішанькі".

**2015**

## КАРЭТА – ДЛЯ КАРАЛЕВЫ

НА ТРЭЦІ "ВІШНЁВЫ ФЕСТЫВАЛЬ" ВІШНЁВАЯ КАРАЛЕВА ПРЫЕХАЛА НА "ЗАЛАТОЙ" КАРЭЦЕ! ТАКІ ПАДАРУНАК ЗРАБІЛІ ФЕСТЫВАЛЮ МАЙСТРЫ ГЛЫБОЦКАЙ КУЗНІ "В АЖУРЕ". ШЛЯХ ДОЎГІ ЧАКАЎ ГАЛОЎНУЮ ГЕРАІНЮ, БО ФЕСТЫВАЛЬНЫЯ ВІШАНЬКІ "ГРАЛІ" Ў ГЛЫБОКІМ АМАЛЬ ЦЭЛЫ ТЫДЗЕНЬ (ЯК НІКОЛІ!).

Сімвалічна, што старт быў дадзены "Спартыўнай Вішняй". Менавіта так арганізатары назвалі першы дзень фестывалю. З цікавінак – забег аматараў фізкультуры па набярэжнай возера "Вішнёвы дуэт" і спаборніцтва "вішнёвых" смажжоў.

А потым фестываль завірыў – літаратурныя сустрэчы, канцэртныя, конкурсныя, гульнявыя праграмы, паказальныя выступленні, майстар-класы, фотавыставы, наву-



кова-практычны семінар, інвестыцыйны форум, тэатралізаванае шэсце, "Вішнёвае вяселле", канцэрт замежных калектываў…

Што ж госці запомнілі найбольш? Думаю, што "Парад вішнёвых пірагоў" (так называўся агляд-конкурс падворкаў) – самае духмянае, маляўнічае і салодкае мерапрыемства. І, канешне, конкурс музыкантаў "А гармонік грае, грае…" – такі меладычны, экспрэсіўны і непрадказальны. Перажывалі ж за нашых! І не дарэмна. Першым уладальнікам шыкоўнага баяна і Гран-пры стаў наш зямляк – Юрый Стрэльчанка. "Вішнёвы фестываль-2015" запаліў новую зорачку на творчым небасхіле – з'явілася група "Вішнёвы горад", створаная пры Глыбоцкім ГДК па ініцыятыве старшыні райвыканкама Алега Морхата.



Дуэт з суседняй Латвіі.

Па традыцыі на "Вішнёвым фестывалі" нашаму гораду жыхары дораць падарункі. І трэці фестываль – не выключэнне. Якраз у адзін з фестывальных дзён была адкрыта Алея ліхтароў на набярэжнай возера Вялікае.

**2016**

## АЗІРНУЎШЫСЯ ВА ЎЧОРА

ПАСЛЯ ЗНАЁМСТВА З ПРАГРАМАЙ МІЖНАРОДНАГА СВЯТА "ВІШНЁВЫ ФЕСТЫВАЛЬ-2017", – З РОССЫПАМ НАЙЦІКАВЕЙШЫХ ВЫСТАЎ, КАНЦЭРТАЎ, КОНКУРСАЎ, ШОУ, СЯРОД ІХ – ШМАТ НАВІНАК, ЯКІЯ, НЕСУМНЕННА, СПАДАБАЮЦЦА ГАРАДЖАНАМ І ГАСЦЯМ, – ПРЫГАДАЎ ЗАЛАЦІНКІ МІНУЛАГОДНЯГА СВЯТА, МЕРАПРЫЕМСТВЫ, ЯКІХ РАНЕЙ МЫ НЕ БАЧЫЛІ, ЯКІЯ ДАПОЎНІЛІ ПРАГРАМЫ РАНЕЙШЫХ ФЕСТЫВАЛЯЎ.

Так, галоўная сюжэтная лінія "Вішнёвага фестывалю-2016" – ушанаванне сям'і. На Цэнтральнай плошчы горада старшыня райвыканкама Алег Морхат і скульптар Іван Казак адкрылі скульптурную кампазіцыю "Сям'я" (Іван Казак, дарэчы, – віцябчанін, ён з'яўляецца таксама аўтарам скульптурнай кампазіцыі "Глыбоцкая вішня"). На адкрыцці былі ўшанаваны жыхары горада Марыя Адольфаўна і Мікалай Аляксандравіч Цяліцы, якія ў 2016 годзе адзначылі залатое вяселле. Праведзены іншыя мерапрыемствы, прысвечаныя тэме "Шчаслівая сям'я – шчаслівая дзяржава".

Упершыню на мінулагоднім фестывалі прайшла спартакіяда сярод кіраўнікоў устаноў, прадпрыемстваў, арганізацый, работнікаў дзяржаўных органаў "Вішнёвая эліта-2016". І для многіх стала адкрыццём тое, што сярод кіраўнікоў, дзяржаўных служачых шмат спартсменаў, актывістаў здаровага ладу жыцця. Сярод пераможцаў, чые прозвішчы на слыху, – дырэктар прафліцэя Валянціна Шынкевіч (армрэстлінг), кіраўнік раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Станіслаў Скіпар (жым штангі лежачы), дырэктар мясакамбіната Анатоль Дук (лёгкая атлетыка), загадчык аддзела традыцыйнай культуры і аматарскай творчасці Аксана Гуменнік (армрэстлінг), старшыня раённай ветэранскай арганізацыі Уладзімір Развадоўскі (шашкі) і многія іншыя.

Упрыгожаннем фестывалю стаў музычны конкурс "А гармонік грае, грае", які сабраў музыкантаў з розных куточкаў краіны, а таксама з бліжняга замежжа. Пераможцам конкурсу нечакана для ўсіх стаў юны Арцемій Казачук з Латвіі. Пад шчырыя апладысменты гледачоў прыз – новы баян – Арцемію ўручыў старшыня райвыканкама Алег Морхат. Хораша праявілі сябе ў конкурсе і прадстаўнікі Глыбоччыны: Уладзімір Бурэнь, Уладзіслаў Салодкі, Віталь Пачкоўскі.

На "Вішнёвым фестывалі-2016" усіх зачаравалі госці з Грузіі – ансамбль песні і танца "Марыі" пад кіраўніцтвам Лэлы Гвенцадзэ і дзіцячы харэаграфічны ансамбль "Тэлаві" (кіраўнік – Георгій Кевхішвілі). Высока ацанілі гледачы і выступленне юных лыжкароў са Свярдлоўскай вобласці.

І яшчэ адна навінка "Вішнёвага фестывалю -2016": вядучых было двое – Вішнёвая Каралева (Святлана Дзякун) і барон Мюнхгаўзен (Павел Пелянак).



**2017**

## В ГОСТИ НА ФЕСТИВАЛЬ

### ТАНЕЦ С НОЖАМИ ПО-КОРЕЙСКИ

Коллектив корейской культуры «Ариранг» основан при Ассоциации Корейцев Беларуси в 2007 году. В репертуаре – образцы корейского придворного, народного, ритуального и нового традиционного танца. На «Вишнёвом фестивале» ансамбль представит: современный танец «Аромат воспоминаний», популярный в Корее танец с ножами «Комму», народный танец с сого «Согочхум».

### «СУДАРУШКИ» С ЭСТОНСКИМ АКЦЕНТОМ

Ансамбль танца «Сударушки» исполнит на главной сцене «Вишнёвого фестиваля» народные и стилизованные русские танцы. «Сударушки» – неоднократный участник международных фестивалей, организатор республиканского фестиваля танца «Сударушки приглашают друзей».

### ЛУКОЯНОВСКИЕ «РОДНИКИ»

Хор «Родники» – один из старейших коллективов художественной самодеятельности в Лукояновском районе Нижегородской области (Россия).

Хор «Родники» – участник праздника «Петров Пуххи» в г. Воротынце Нижегородской области, постоянный участник областных праздников и фестивалей, тесно сотрудничает с Республикой Мордовия.

### КАЗЛЯРСКАЯ КАПЭЛА З ВЕЛІКАПОЛЬШЧЫ

У склад гэтага гурта ўваходзяць выпускнікі і вучні Дзяржаўнай Музычнай Школы ў Збоншыні (Вялікапольшча, Польшча), якая з моманту заснавання ў 1950 годзе вядзе заняткі па класе народных інструментаў. Музыканты захоўваюць традыцыі Рэгіёну Казла, а іх рэпертуар складаюць маршы, вальцэркі, шочы, кругавыя, полькі, абэркі і віваты, а таксама народныя песні і прыпеўкі.

### КОГДА ПОЮТ ИЗРАИЛЬСКИЕ ДЕТИ

Детский хор «Виланелла» образован в 2002 году на базе консерватории Кирият Бялик – Израиль. В хоре поют ученики консерватории в возрасте от 12 до 18 лет, которые занимаются игрой на музыкальных инструментах и постановкой голоса. В репертуаре хора произведения современных израильских композиторов, обработки народных песен, классическая духовная и светская музыка.

### КАПЕЛЛА ИЗ ШВЕНЧЁНСКОГО КРАЯ

Объединённую «Капеллу народной музыки Швенчёнского края» составляют 9 представителей, профессионально исполняющих литовские народные песни и музыку.

Специально для «Вишнёвого фестиваля» капелла подготовила народную песню на белорусском языке.

### «АКОЛІЦА»…ИЗ ЛАТВИИ

Ансамбль «Аколіца» Дагдского белорусского общества «Вербіца» основан в 2013 году. В его репертуаре – белорусские народные песни, фольклорные обрядовые песни, современные песни, а также песни на латышском, латгальском, русском языках.

Ансамбль – участник различных фестивалей в Латвии, Беларуси, Польше и многих мероприятий, проводимых в Дагдском крае и Латвии.

### МАГИЯ АРМЯНСКОГО ТАНЦА С «ЭРЕБУНИ»

Фольклорный танцевальный ансамбль «Эребуни» был основан в 1998 году при Минском городском культурно-просветительском обществе «Айастан» Республиканского центра национальных культур.

В репертуаре ансамбля «Эребуни» более 50 танцев и хореографических постановок.

### ПОД РУССКУЮ ГАРМОНЬ

Из Шлиссельбурга (Россия) приедет коллектив «Узорье» КСК «Невский». В коллективе – люди разного возраста, разных профессий, влюблённых в русскую песню. Они исполняют фольклорные произведения разного характера (лирические, хороводные, плясовые, шуточные) и авторские произведения, как с музыкальным сопровождением, так и без него.

## У ЧАКАННІ «ВІШНЁВАГА ФЕСТЫВАЛЮ»

● Падрыхтавала А. СІНІЦКАЯ,
студэнтка ІІІ курса Інстытута журналістыкі БДУ.

### АПЫТАННЕ\\\

НАПЯРЭДАДНІ «ВІШНЁВАГА ФЕСТЫВАЛЮ» Я ЗВЯРНУЛАСЯ ДА ГЛЫБАЧАН І ГАСЦЕЙ ГОРАДА І СПЫТАЛА: "ЧЫМ АСАБІСТА ВАС ПРЫВАБЛІВАЕ ГЭТА СВЯТА І ЧАГО ВЫ ЧАКАЕЦЕ АД ЮБІЛЕЙНАГА ФЕСТЫВАЛЮ СЁЛЕТА?"

**Васіль Ляшонак, дыспетчар РЭС:**

– Напярэдадні фестывалю і без таго працавітыя жыхары горада яшчэ больш актывізуюцца, на вуліцах, плошчах, у скверах кіпіць работа. Горад прыгажэе на вачах: у ім мора кветак, з'яўляюцца новыя скульптурныя кампазіцыі, living рознае дэкаратыўнае аздабленне і гэта, вядома ж, радуе. На жаль, сёлета ўраджай вішняў не радуе, але горад, нягледзячы на гэта, усё роўна нагадвае вішнёвы сад: такі эфект стварае адпаведнае штучнае аздабленне. А яшчэ мне падабаецца тое, што фестываль прыцягвае ў горад турыстаў, людзей з другіх краін, якія высока ацэньваюць арганізацыю свята.

**Яўген Ісаенка, дырэктар ЧТУП «ГАМТ»:**

–Фестываль – гэта добрая традыцыя нашага краю. Радуе, што сябры з розных гарадоў пры сустрэчы заўсёды згадваюць пра яго, а калі прыязджаюць у госці, мы наведваем розныя мерапрыемствы. Асабіста мне больш за ўсё падабаюцца спартыўныя гульні і спаборніцтвы, за якімі і назіраць цікава, і самому паўдзельнічаць можна. Лічу, што фестываль – выдатная магчымасць для развіцця турызму і рэкламы нашай культуры.

**Ала Архіпава, інжынер з Санкт-Пецярбурга:**

– Я нарадзілася і вучылася ў Глыбокім, а затым паступіла ў Санкт-Пецярбург, выйшла замуж. Тут застаўся бацькоўскі дом, таму кожны год стараюся прыязджаць у родны край. Вельмі рада, што на Глыбоччыне праходзіць фестываль міжнароднага маштабу. Асабліва падабаюцца ў ім канцэртныя праграмы з удзелам замежных калектываў, якія прадстаўляюць сваю культуру і традыцыі. Шмат арыгінальных вырабаў, рэчаў, сувеніраў прадстаўлена на выставах-продажах – ёсць што выбраць, каб падарыць сябрам.

**Вольга Шалаева, пенсіянерка:**

– Кожны год чакаю «Вішнёвы фестываль» і думаю: што ж новае будзе ў праграме, чым здзівяць на гэты раз? Стараюся пабываць на адкрыцці і закрыцці фестывалю – гэта самыя ўрачыстыя яркія і запамінальныя моманты свята. Падабаюцца скульптурныя кампазіцыі, асабліва вішнёвая, і "сямейная", каля якіх госці пастаянна праводзяць фотасесіі. Сама люблю гатаваць, таму цікаўлюся выставамі кулінарных вырабаў з вішні і для сябе запісваю новыя рэцэпты.

**Дар'я Анашкевіч, вучаніца СШ№2:**

– Мне падабаюцца маладзёжныя мерапрыемствы, якія ладзяцца ў рамках фестывалю, на якіх я бываю не толькі ў ролі гледача, але і ўдзельніцы, таксама канцэрты. Яшчэ мяне цікавяць выставы народнай творчасці, бо там ёсць на што паглядзець і чаму павучыцца, а таксама фотавыставы. Запомніліся, напрыклад, работы маладога аўтара Ігара Лася. Фестываль пастаянна адкрывае новыя імёны, здзіўляе, а таму і ў гэтым годзе я чакаю фестывальных сюрпрызаў. Дзякуючы "Вішнёваму фестывалю", летнія канікулы становяцца займальнымі і незабыўнымі.

**Марына Ігнацьева, спецыяліст па продажы на МКК:**

– Вішнёвы фестываль у Глыбокім такі ж яркі, каляровы, як само лета, ён радуе навізной, а праграмы здзіўляюць універсальнасцю. Мне вельмі падабаецца атмасфера, у якой знаходзіцца горад і ў якой прабываюць людзі. Гэтае свята ўносіць у наша прызвычаенае будзённае жыццё святочную мітусню, стракатыя фарбы, радуе талентамі. Асабіста мяне цікавіць садаводства і на фестывалі ёсць магчымасць сустрэцца з прафесіяналамі гэтай справы, атрымаць неабходны досвед і вопыт, падвучыцца. А яшчэ падабаюцца сувеніры, якія прадаюцца падчас кірмашоў.

**Анастасія Кузняцова, студэнтка:**

– З даўніх часоў Глыбокае славілася вішнёвымі садамі і вішняй, якая стала сімвалам нашага горада і падарыла нам "Вішнёвы фестываль". Спадзяюся, што гэтая добрая традыцыя будзе ўмацоўвацца і існаваць доўгія гады. Хочацца, каб у нашай краіне было пабольш такіх самабытных свят.

# НАВІНКІ ЮБІЛЕЙНАГА ФЕСТЫВАЛЮ

● Галіна СУТУЛА.

ПЕРАД "ВІШНЁВЫМ ФЕСТЫВАЛЕМ" ГОРАД ЯШЧЭ БОЛЬШ АБНАВІЎСЯ І ПАПРЫГАЖЭЎ. МНОГІЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ І АРГАНІЗАЦЫІ ЎНЕСЛІ Ў ВЫТВОРЧЫ ПРАЦЭС ВІШНЁВЫ НАСТРОЙ: НА ФАСАДАХ З'ЯВІЛІСЯ МАЛЮНКІ, РЭКЛАМНЫЯ ВЫВЕСКІ, НАКЛЕЙКІ З ВІШНЁВЫМІ ГРОНКАМІ, САМАРОБНЫЯ СА СПАДРУЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ "САКАВІТЫЯ" ФРУКТОВЫЯ ГРОНКІ.

Акрамя гэтага, юбілейны фестываль можа пахваліцца новай рэзідэнцыяй Вішнёвай Каралевы. Работнікі УП ЖКГ устанавілі яе напярэдадні свята ў трохкутніку, які з аднаго боку прымыкае да набярэжнай возера Кагальнага, з другога – суседнічае з раённым аддзелам Дэпартамента аховы, а з трэцяга – з вуліцай Мінскай. Пасля фестывалю гэтае месца можа стаць любімым месцам адпачынку глыбачан, а для гасцей горада – яшчэ адным аб'ектам для фотасесій.

Сярод навінак юбілейнага фестывалю – і сімвал дабрачыннай дзейнасці – вішнёвік – яркая цацка з элементамі беларускага аздаблення, якая прыносіць радасць выздараўлення хворым дзецям і дапамагае збіраць сродкі на іх лячэнне. Кожны, хто прыйдзе на свята, можа ахвяраваць вішнёвіку некалькі рублёў, якія пойдуць на аперацыю для маленькага глыбачаніна Рамана Куніцкага. Аўтар ідэі вішнёвіка – Людміла Чэбан, аўтар назвы, легенды і песні пра вішнёвіка – Галіна Сутула і Ганна Шакола, майстрыха, якая вырабляе вішнёвікаў -- Іна Саколка, а творчым натхняльнікам і арганізатарам праекта з'яўляецца настаўніца Галіна Кухта. Усе яны -- сябры РА РГА "Белая Русь", якія займаюцца дабрачыннасцю не першы год і сёлета з дапамогай вішнёвіка, цацкі якую так палюбілі і дзеці, і дарослыя, спрабуюць актывізаваць і пашырыць маштабы сваёй дзейнасці.

Напісаць наперад пра ўсё, што будзе на фестывалі – проста немагчыма, таму прыходзьце на свята -- самі ўсё ўбачыце.

# ГЛЫБОЦКАЯ ВІШНЯ – САМАЯ ТРЫВАЛАЯ!

● Галіна СУТУЛА. Фота аўтара.


Падсвільскія садаводы Уладзімір і Таццяна Бурэнь.

УЛАДЗІМІР І ТАЦЦЯНА БУРЭНЬ ЖЫВУЦЬ У ПАДСВІЛЛІ, ЗАЙМАЮЦЦА САДАВОДСТВАМ. НА ІХНІМ ПРЫСЯДЗІБНЫМ УЧАСТКУ БОЛЬШ ЗА СТО ГАТУНКАЎ ЯБЛЫНЬ, СЛІЎ, ГРУШ, ПЕРСІКАЎ, ВІНАГРАДУ, ВІШАНЬ І ЧАРЭШНЯЎ… ДЛЯ СЯМ'І БУРЭНЬ САДАВОДСТВА – АСНОЎНЫ ЗАНЯТАК, З ДАПАМОГАЙ ЯКОГА ЯНЫ ЗАРАБЛЯЮЦЬ НА ХЛЕБ НАДЗЁННЫ. ПРА ТОЕ, ЯК ПЕДАГОГ І МЕХАНІК АДКРЫЛІ СВАЮ СПРАВУ, МЫ І ПАГАВАРЫЛІ ПРЫ СУСТРЭЧЫ.

–Я родам са Смаленскай вобласці, ужо 35 гадоў жыву ў Беларусі, з іх тры дзесяцігоддзі – на Глыбоччыне, якая стала для мяне другой радзімай. Па дыпломе я настаўніца фізікі і матэматыкі, заканчвала Віцебскі педагагічны інстытут. Разам з мужам працавалі на Падсвільскай дзіцячай турбазе. Калі пачаліся змены ў грамадстве, вырашылі змяніць прафесійны профіль і мы. Рашыліся і ў сорак гадоў рэзка развярнулі жыццё на 180 градусаў. Мы ўжо мелі свой дом, 30 сотак участка, на якім пачалі вырошчваць гародніну. Але гэты від дзейнасці не прынёс ні жаданага задавальнення, ні прыбытку, і мы пасадзілі фруктовы сад, – расказвае Таццяна Аляксееўна.

–Саджанцы купілі ў Лепельскім гадавальніку, дзе працаваў муж маёй сяброўкі Віктар Быкаў. Ён рэкамендаваў нам патрэбную для набыцця тэарэтычных ведаў літаратуру, параіў спецыяліста, які на першым часе дапамагаў нам прышчапляць саджанцы. Чаранкі для прышчэпак самі вырошчвалі, куплялі ў гадавальніках і прыватных садаводаў. Пазней, як разабраліся з тэхналогіяй і працэсам, практычна падвучыліся – стала прасцей. Цяпер нашы соткі – гэта эксперыментальная пляцоўка, дзе мы апрабіруем новыя гатункі, пастаянна нешта садзім і перасаджваем.

Калі гаварыць пра вішні, то ў садзе Бурэняў больш беларускіх гатункаў: "Сеянец 1", "Вянок", які з'яўляецца выдатным апыляльнікам для ўсіх гатункаў, у тым ліку і для гібрыдаў, "Навадворская", "Заранка", "Ласуха" гібрыдная вішнёва-чарэшневая "Жывіца", самая ўраджайная "Маладзёжная" і, вядома ж, "Глыбоцкая", афіцыйна зарэгістраваная ў Беларускай энцыклапедыі сельскага гаспадара, выдадзенай у Мінску ў 1994 годзе. Растуць тут чарэшні "Сюбараўская", "Гронкавая", "Саперніца", "Асалода", "Гасцінец"… Большасць гатункаў хуткаплодныя і на трэці год ужо даюць ураджай. Па-суседству з беларускімі вішнямі мірна ўжываюцца і прывазныя з паўднёвых краін.

–Сёлетняя зіма стала своеасаблівым тэстам на выжыванне для ўсяго сада. У нас дзве "дарослыя" вішні загінулі ад холаду, што ўжо казаць пра "маладняк". Пладоў сёлета не далі, але хоць перазімавалі ды жывымі засталіся і то добра, – кажа Таццяна. – Найбольш холада- і стрэсаўстойлівымі аказаліся нашы глыбоцкія вішні, якія прызвычаіліся да мясцовага клімату – і гэта іхні вялікі плюс.

–Каб вырасціць новы саджанец, трэба тры гады і за гэты час 77 разоў яму пакланіцца, – уступае ў размову гаспадар. – А каб ацаніць каштоўнасць таго ці іншага гатунка – спатрэбіцца не менш за дзесяць гадоў. Многім здаецца, што пасадзіў дрэва, нічога не рабі, чакай толькі ўраджаю. Гэта памылка. Сад патрабуе пастаяннага догляду, а асноўны рабочы інструмент у нас – уласныя рукі. Іх у нас дзве пары, трэцяя сына – ён дапамагае час ад часу, калі не на працы. У сезон мы па пяць-шэсць разоў займаемся прапалкай, палівам, праводзім прафілактыку, каб захаваць дрэвы ад усялякіх хвароб і насякомых. Стараемся не выкарыстоўваць хімію, народнымі сродкамі абыходзімся. Змагаемся з самымі страшнымі і хітрымі звярамі – зайцамі, якія кару падчыстую зімой аб'ядаюць ад голаду, а вясной-летам шкодзяць дрэвы забаўляючыся. Хоць і хапае клопатаў, але справа гэта нам падабаецца. Калі адчуваеш дрэва, то яно само падказвае, калі і што трэба рабіць, каб яно хутчэй пладаносіла.

Вясной і восенню муж і жонка гандлююць на рынках: у іх свой рабочы графік. Прадаюць саджанцы ў чацвер у Падсвіллі, па пятніцах – у Докшыцах, па суботах – у Шаркоўшчыне, а ў нядзелю едуць у Глыбокае. Іх ужо добра ведаюць у ваколіцах, часта пакупнікі прыязджаюць дамоў. Летам саджанцы "раз'язджаюцца" ў Мінск, Віцебск, у Расію – іх купляюць госці, што праводзяць водпуск у пасёлку. Апошнія гады Таццяна і Уладзімір у якасці падарунка прывозяць саджанцы гаспадарам дома сямейнага тыпу Рыгору і Таццяне Грабко. І ў садзе дома для састарэлых і інвалідаў у Петрунова падрастаюць маладыя дрэўцы ад падсвільскіх садаводаў…

Сёлета ў садзе Бурэняў ураджай вішняў небагаты, але гаспадары ад душы частуюць гасцей леташнім вішнёвым кампотам. За юбілейны "Вішнёвы фестываль", землякі!



# ВІШАНЬКІ… КАЛЯ МУЗЕЯ



● Тэкст і фота А. САДОВІЧА.

ІДЭЯ МАСТАЦКАЙ КАМПАЗІЦЫІ КАЛЯ ГІСТОРЫКА-ЭТНАГРАФІЧНАГА МУЗЕЯ – ВЯЛІКІЯ ПРЫГОЖАНЬКІЯ ВІШАНЬКІ З ЛІСТОЧКАМІ – НАЛЕЖЫЦЬ СУПРАЦОЎНІЦЫ МУЗЕЯ ДАР'І ХРОЛ (**НА ЗДЫМКУ**).

–Горад наш вельмі прыгожы ў любую пару года, але перад "Вішнёвым фестывалем" ён проста расцвітае: вішанькі – на кожным кроку, – пры сустрэчы распавяла Дар'я. – І мне, калі ў горадзе аб'явілі конкурс паміж арганізацыямі, даручылі прыдумаць што-небудзь такое, цікавае, арыгінальнае, што зачаравала б усіх, хто будзе праходзіць каля музея. Прыдумка здоўжылася: кампазіцыя на двары – гэта зусім не тое, што у будынку: тут трэба найперш улічваць умовы надвор'я – вецер, дождж, навальніцу. І матэрыял падабраць адпаведны. Азарэнне прыйшло спантанна: прыгадала, што на навагоднюю выставу я рабіла цацкі з лазы. І цацкі атрымаліся. Падзялілася сваёй ідэяй з нашым рабочым Іванам Флер'янавічам Януковічам, які, пакарыстаюся словамі Якуба Коласа, "што ні замысліць, то ўсё зробіць", і так зробіць, што вачэй нельга адвесці, бо майстар на ўсе рукі. Крыху падумаўшы, Іван Флер'янавіч узяўся за справу. Напачатку не ўсё атрымлівалася: першая партыя лазы, нарыхтаваная ім, ламалася, і ён урэшце знайшоў больш гнуткую. Калі ж працэс, як кажуць, пайшоў, Іван Флер'янавіч ужо не проста плёў лазу, а тварыў, гарэў у працы. Фарбаваць, устанаўліваць вішанькі памагалі ўсе работнікі музея. Атрымалася нават лепш, чым я сабе ўяўляла. І ў дні фестывалю нашы вішанькі будуць радаваць сваім хараством глыбачан і гасцей горада.



# «У ГЛЫБОКАЕ ЕДЗЬ ПА ВІШНІ, БО ГЛЫБОКАЕ – ДОБРЫ ЗНАК»

● Алесь ЖЫГУНОЎ.

СМАК ГЛЫБОЦКАЙ ВІШНІ СТАЛІЧНЫ ПАЭТ НАВУМ ГАЛЬПЯРОВІЧ АДЧУЎ ЯШЧЭ З ТЫХ ЧАСОЎ, КАЛІ ПРАЦАВАЎ УЛАСНЫМ КАРЭСПАНДЭНТАМ РЭСПУБЛІКАНСКАГА РАДЫЁ І ПА ЖУРНАЛІСЦКІХ СПРАВАХ ЧАСТА ПРЫЯЗДЖАЎ НА ГЛЫБОЧЧЫНУ: ПІСАЎ ПРА ДАСЯГНЕННІ РАЁНА, ПРА СЛЫННЫХ І ТАЛЕНАВІТЫХ ЛЮДЗЕЙ НАШАГА КРАЮ. І ПРОСТА НЕ МОГ АДЗІН-ДРУГІ РЭПАРТАЖ НЕ ПРЫСВЯЦІЦЬ ГЛЫБОЦКАЙ ВІШНІ.

Сёння Навум Гальпяровіч – кіраўнік радыёстанцыі "Беларусь", аўтар шматлікіх зборнікаў паэзіі і прозы. І добры сябар глыбоцкіх літаратараў. Днямі ён пазваніў і падзяліўся апошнімі навінамі, і сярод іх адна з гісторый (супадзенне?) утрымлівала ў сабе вішнёвую тэматыку:

--У год 135-годдзя Якуба Коласа мне захацелася праехаць па памятных мясцінах народнага паэта. Я пабываў у філіяле літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, які аб'ядноўвае Акінчыцы, Альбуць, Смольню і Ласток – сядзібы, дзе прайшлі дзіцячыя гады паэта. І з вуснаў загадчыцы філіяла Соф'і Міцкевіч пачуў расказ пра дзядзьку Антося, добра вядомага нам з паэмы "Новая зямля". Дзядзька Антось – пра гэта гаворыцца і ў паэме Якуба Коласа -- быў майстрам на ўсе рукі. Цудоўна валодаў разцом, які выкарыстоўваў для вырабу лыжак. Лыжкі рабіў з вішнёвага дрэва. Чаму з вішнёвага? Таму што вішня добра апрацоўваецца, забірае гарачыню і не апякае ні нёба, ні язык, ні вусны. Гэта сапраўды так: я еў такой лыжкай вішнёвае варэнне, і яно было вельмі-вельмі смачным, мне здалося, што такога варэння не еў ніколі. У Глыбокім, ведаю, ёсць нямала народных майстроў, якія, акрамя ўсяго, цудоўна валодаюць разцом. Вішні ў вас ёсць, павінны быць і лыжкі з вішнёвага дрэва, калі ж няма, то зрабіце. Вы ж святкуеце штогод "Вішнёвы фестываль", і, як я думаю, вырабаў з вішні ў вас павінна быць як мага больш.

А потым зусім нечакана для мяне прачытаў свой новы верш.

Крышку праясню сітуацыю з гэтым вершам. Усё ў тым, што сын Навума палюбіў дзяўчыну з глыбоцкай вёскі Шуневічы. Маладыя пабраліся шлюбам, і неўзабаве ў іхняй сям'і нарадзіўся хлопчык.

Калі раней паэт проста прыязджаў на Глыбоччыну – на літаратурныя вечары, к сябрам, то цяпер ён наведвае сваіх глыбоцкіх сваякоў і добра ведае пра святы, фестывалі, фэсты, якія праходзяць у Глыбокім. Больш таго, глыбоцкая зямля, яе дзіўная прыгажосць, як сам прызнаўся аднойчы, натхняе яго на творчасць. У прыватнасці, натхніла на напісанне вось гэтага верша.

**М**не параілі хлопцы ўвішныя:
--Калі вішняў не зведаў смак,
У Глыбокае едзь па вішні,
Бо Глыбокае – добры знак.

Працавіты там люд, не спешчаны
І спагадлівы да сяброў.
І прывозіў я вішні спелыя
Ад глыбоцкіх шчодрых садоў.

А цяпер па выходных раніцай
Едзе ў вёску са мной унук,
Бо яго сёння вішні радуюць
Ад бабуліных шчодрых рук.

І цяпер мае сэрца горнецца
Да глыбоцкіх маіх сваякоў,
Бо ў расквечаным вішнямі горадзе
Сваё шчасце мой сын знайшоў.



**МАЛАДОСЦЬ**
***Аляксандр Жыгуноў***

У белыя пайду сады,
Туды, дзе подых маю.
Які ж ты, хлопча, малады, –
Галінкай яблынька вітае.
Які шчаслівы ты, юнак, –
Прашэпчуць вішні каля плоту.
Яны мне скажуць: чуй, дзівак,
Яна кахае цябе ўпотай!
1977 г.

**ВИКА И ВИШНЯ**
***Зоя Новоенко***

Наливалась соком вишня.
Вика с дедом в садик вышла:
Ягод внучка захотела,
Только вишня не созрела.
Дед сказал: «Ты подожди –
Скоро кончатся дожди,
Покраснеет вишня в срок,
А с зелёной – какой прок?
Не пошла Вика гулять:
На пенёк присела – ждать…
…День проходит, вечереет:
Что-то вишенка не зреет?
Солнце спряталось за тучи:
Своевольный выполз лучик.
Удивлён луч солнца был:
Кто-то девочку забыл…
У пенька грустит лукошко,
А под вишней дремлет крошка.

**ВІШНЁВЫ ФЭСТ**
***Людміла Яфімава***

Якая асалода –
Вішня з мёдам.
Паспытай, мілы,
Прыдасць табе сілы.
Мяне пакахаць,
Ночку гуляць.
Спяваць, танцаваць,
Дзяўчат запрашаць.
Ешце вішню з мёдам,
Прыдасць асалоду:
На радасць, на згоду,
На шчасце ў хаце,
На мір, на багацце.
Маё пажаданне:
Разам з вішня чароўнай
Дарыце каханне.

# СПЯВАЕМ РАЗАМ «ВІШНЁВЫЯ» ПЕСНІ

*На галоўнай святочнай сцэне горада на "Вішнёвым фестывалі – 2013" упершыню прагучалі песні самадзейных кампазітараў Браніслава Грамакоўскага і Ганны Шаколы на словы Алеся Жыгунова і Галіны Сутула. Выконваліся яны і на ўсіх наступных фестывалях.*



***Алесь Жыгуноў***
**ГЛЫБОКАЕ – ВІШНЁВЫ ГАРАДОК**

Куды ні глянеш – сад альбо садок,
Тут прыгажосцю можна наталіцца.
Глыбокае маё — вішнёвы гарадок,
Такая вось вішнёвая сталіца.
**Прыпеў:**
Вішні ў кожным садзе,
Вішні ў тваім паглядзе,
Вішні паспелі у Глыбокім;
Вішні у кожным доме,
Вішнямі мы вядомы
У блізкім замежжы і ў далёкім.
За летам восень просіцца ў радок.
А хочацца пабачыць саду квеценьь.
Глыбокае маё – вішнёвы гарадок,
Вясновы самы на ўсёй планеце.
Сады цвітуць, і ружавее даль.
І пачуццём ты поўнішся высокім.
І спадзёмся мы: вішнёвы фестываль
Штогод збіраць
нас будзе у Глыбокім.
Прыпеў.

***Галіна Сутула***
**ВІШНЁВЫ БАЛЬ У ГЛЫБОКІМ**

Спелым водарам вішнёвым
Напаўняюцца сады.
Сакавіта-адмысловы
Ліпень шчодра-малады.
Раскашуе каралевай
Вішанька глыбоцкая.
Дзе ты: справа, а ці злева
Шчасцейка дзявочае?
Гронкі яркія - гімн лету -
У прыгоршчы просяцца.
Словы шчырыя паэтаў
Ад душы ўзносяцца.
Раскашуе каралевай
Вішня фестывальная.
Свята - справа, свята - злева
Усім запамінальнае!
І куды не кінеш вока
Тут і там - салодкі рай.
Красуе вішня ў Глыбокім -
Багаты будзе ўраджай!
Наша вішня каралеўна
Упрыгожыць фестываль.
Па-глыбоцку дзіўна-спеўна
Кружыцца вішнёвы баль.

# ПРОГРАММА
## МЕЖДУНАРОДНОГО ПРАЗДНИКА «ВИШНЕВЫЙ ФЕСТИВАЛЬ» В Г. ГЛУБОКОЕ С 19 ПО 22 ИЮЛЯ 2017 ГОДА

### 19 ИЮЛЯ ДЕНЬ СПОРТА «ОЛИМПИЙСКАЯ ВИШНЯ – 2017» *(городской стадион)*

**17.30 – 20.30** Вторая спартакиада Глубокского района среди руководителей учреждений, предприятий, организаций и работников государственных органов «Вишневая Элита – 2017»
Спортивный этап конкурса красоты «Мисс экстрим»
**17.30 – 21.00** Гигантские шашки
Гигантские шахматы
Гигантские ходули
Гигантские лыжи
Гигантские крестики-нолики
Гигантские пятнашки
Гигантские гири
**18.00 – 20.00** Гигантский турнир «Человек – Гигант»
**18.00 – 19.00** Гигантский забег улиток
**19.00 – 20.00** Гигантский волейбол
**21.00 – 22.00** Гигантский футбол (бамбербол)

### 20 ИЮЛЯ ДЕНЬ МОЛОДЕЖИ «ВИШНЕВАЯ ФЕЕРИЯ» *(ЦЕНТРАЛЬНАЯ ПЛОЩАДЬ)*

**17.00 – 19.00** Авто-шоу «Вишневый заезд»
**19.10 – 20.20** Мисс-лето на «Вишневом фестивале»
**20.30 – 21.30** Гала-концерт молодых исполнителей с показом молодежной моды «Вишневый стиль»
**21.30 – 23.00** Вишневая феерия танца с участием ди-джеев

### 21 ИЮЛЯ ЭТНО-ВИШНЯ

**14.00** Пресс-конференция
***Зал заседаний райисполкома***
**14.40 – 15.00** Гашение почтовой марки в честь «Вишнёвого фестиваля» г. Глубокое специальным почтовым штемпелем
***Зал заседаний райисполкома***
**15.30** Посадка дубравы дружбы
***Автомобильная дорога Р45 Полоцк – Глубокое (85 км.)***
**15.30** Научно-практическая конференция по садоводству
***Глубокский городской Дом культуры***
**16.30** Открытие выставки живописи Э.В.Матюшонка «Год за годом»
***Глубокский центр традиционной культуры и народного творчества (ул. Ленина, 40)***
**17.00 – 21.00** Выставка-ярмарка работ народных мастеров «Вішнёвы кірмаш»
***Центральная площадь***
**17.30 – 21.00** Этно-вечеринка «У вішнёвым садзе» (хороводы, мастер-классы по танцам). Дефиле народного костюма «Па слядах часу»
***Центральная площадь***
**21.00 – 24.00** Этно-дискотека «В кругу друзей»
***Центральная площадь***

### 22 ИЮЛЯ ВИШНЕВЫЙ КРАЙ *(ЦЕНТРАЛЬНАЯ ПЛОЩАДЬ)*

**10.00 – 10.30** Выставка-продажа кулинарных изделий «Вишневые гостинцы»
***Торговый центр «Родны кут»***
**10.30 – 11.00** Торжественное шествие «В гостях у Вишни». Открытие на Центральной площади декоративно-художественной композиции «Дружба народов»
**11.00 – 13.00** Праздничная программа «С юбилеем, фестиваль!»
**13.00 – 14.00** Смотр-конкурс подворий «Вишневый погребок»
**14.00 – 15.00** Концертная программа «Вишневая карусель»
**15.00 – 16.00** Торжественная регистрация брака «Вишневая свадьба»
***Сквер молодоженов***
**16.00 – 18.00** Конкурс баянистов «Вишневые наигрыши»
**18.00 – 19.00** Дефиле участниц конкурса красоты «Мисс экстрим»
**19.00 – 21.00** Гала-концерт «Вишневое соцветие дружбы»
**21.00 – 21.40** Торжественная церемония закрытия Международного праздника «До свидания, фестивальная Глубоччина».
Аукцион «Вишневый пирог»
**21.40 – 23.00** Концертная программа «Вишневая нота – 2017»
**23.00 – 23.10** Праздничный фейерверк
**23.10 – 01.00** Молодежная площадка «Вишневый опен-эйр»

### В ПРОГРАММЕ ПРАЗДНИКА

**09.00 – 15.00** Работа подворий «Вишневый погребок»
***г. Глубокое, ул. Ленина (от 1 до 2 светофора)***
**09.00 – 22.00** Арт-проект «Вишневый каламбур»
***возле Глубокского центра традиционной культуры и народного творчества (ул. Ленина, 40)***
Выставка «Вишневый цвет». Выставка музыкальных инструментов «А гармонік грае, грае…»
***возле Глубокского центра традиционной культуры и народного творчества (ул. Ленина, 40)***
Работа торговых рядов
***по ул. Энгельса***
Работа тематических площадок
Выставка-ярмарка работ народных мастеров «Вишнёвый АРБАТ».
Мастер-класс по изготовлению «Вишневого сувенира»
***по ул. Гагарина, ул. Ленина***
**09.00 – 18.00** Туристическая ярмарка
***Набережная озера Кагальное***

***21.07 с 9.00 до 21.00 – участие Витебского аэроклуба имени А. К. Горовца***

# Поздравляем!

***Чеславу Петровну ВЫШАТКО***

Сердечно поздравляем с 80-летним юбилеем!

*Пусть годы проходят, не надо грустить,*
*Ведь сколько отпущено, надо прожить.*
*И счастье бывало, бывала и грусть,*
*Из жизни не вычеркнуть пройденный путь.*
*Пусть годы идут, а душа не стареет,*
*Пусть внуки растут, голова не седеет.*
*Пусть сердце не знает ни боли, ни скуки,*
*Пусть радость приносят и дети, и внуки.*

**Дети, внуки, правнучки.**

# ВІШНЁВЫЯ ТРАДЫЦЫІ ГЛЫБОКАГА

● Алена ХАЙНОЎСКАЯ.

НАШ ГОРАД ЗДАЎНА СЛАВІЎСЯ СВАІМІ САДАМІ. НЕКАЛІ ТУТ БЫЛІ ДВА МАНАСТЫРСКІЯ САДЫ – КАРМЕЛІЦКІ І БАЗЫЛЬЯНСКІ, САД У МАЁНТКУ МАСАЛЬСКАГА (ЯК ПАМЯЦЬ ПРА ГЭТА – ВУЛІЦА САДОВАЯ).

Вішнёвая слава Глыбокага множыцца з кожным годам і, як вядома, вядзецца з "польскіх часоў". Мясцовыя старажылы згадвалі, што ў садзе агранома Баляслава Лапыра, які прывозіў высадкі з Польшчы, ох, і смачныя збіралі вішанькі. А пакольки для тутэйшых сялян ён не шкадаваў анічога, то "лапыровы" вішні разрасталіся ў кожным двары. І менавіта ім было выведзена некалькі новых гатункаў садовых вішнёвых дрэў.

Колькі слоў пра Баляслава Лапыра. Нарадзіўся ён 5 мая 1895 года. У пачатковай школе Баляслаў вучыўся ў Браславе (на радзіме бацькі), потым у Коўна і ў Пецярбургу, дзе ў 1916 годзе закончыў навучальную ўстанову па спецыяльнасці агранома.

З жонка Стэфаніяй Страшэвіч набылі 11 гектараў зямлі ля Глыбокага. Займаючы пасаду павятовага агранома, Баляслаў Лапыр быў дарадчыкам і памочнікам для простых людзей, вучыў мясцовых сялян па-навуковаму весці гаспадарку. У нашых вёсках праводзіў агранамічныя курсы, быў ініцыятарам правядзення сельскагаспадарчых выстаў.

У першыя гады Вялікай Айчыннай вайны Баляслаў Лапыр жыў у Глыбокім. Многіх местачкоўцаў выратаваў ад выгнання ў Германію, але ў верасні 1943 года вымушаны быў пераехаць з сям'ёй туды, дзе прадаўжаў сваю справу: выводзіў новыя гатункі збожжа ў нямецкім маёнтку.

У красавіку 1945 года сям'я Лапыроў вярнулася ў СССР, была арыштавана. Пасля аднаго з допытаў Баляслаў Лапыр не вярнуўся…

Толькі памяць пра "харошага, душэўнага, інтэлігентнага" агранома Баляслава Лапыра, а менавіта такім згадвалі яго глыбоцкія старажылы, яшчэ жыве. І самыя смачныя вішні на Глыбоччыне заўсёды будуць лапыровымі. "Вішнёвы фестываль" гэтаму пацвярджэнне.



«Веснік Глыбоччыны»
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Глыбоцкі раённы выканаўчы камітэт, раённы Савет дэпутатаў.
Выходзіць у сераду і суботу.
Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйны № 73 ад 3 сакавіка 2009 г. Індэкс 63968.
Аўтары нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў.

Адрас: 211800, г. Глыбокае, вул. Чырвонаармейская, 2.
E-mail: glubokoe@vitebsk.by
ТЭЛЕФОНЫ
рэдактара – 5-38-17,
намесніка рэдактара – 5-38-19,
адказнага сакратара і аграпрамаддзела – 5-38-15,
аддзела сацыяльных праблем і сувязей з грамадскасцю – 5-38-14,
бухгалтэрыі – 5-38-16 (факс),
аддзела рэкламы – 5-38-17 (факс).

Р/р BY06AKBB30120249255892300000 у ЦБП № 208 ф-ла № 216 ААТ «ААБ Беларусбанк» у г. Полацку. МФА AKBBBY21216, УНП 300022458, АКПА 02478065
ISSN 2075-7964

Галоўны рэдактар Андрэй Міхайлавіч ПАНКРАТ
Дызайн і вёрстка Сяргея Краўчонка.
Карэктар Іван Букоўскі.

Газета набрана на настольна-выдавецкай сістэме ў рэдакцыі, перададзена па каналах сувязі і надрукавана ў КПУП «Навапалацкая друкарня»: вул. Блахіна, 26. Друк афсетны.
Падпісана ў друк 18.07.2017 г. у 17.00. Заказ № 3634. Тыраж 6478.